Святлана Вяргеенка (Гомель, Беларусь)

УДК 398(476):398(477)

**Сюжэтаўтваральныя матывы ў беларускіх і ўкраінскіх замовах**

У статті розглядаються питання, що стосуються функціональної ролі одного з основних міжфункціональних мотив "Міфологічний центр, в якому знаходиться лікар ..." в білоруських і українських змовах. Аналізуються локуси і персонажі, які є основними структурними компонентами названого мотиву. Відзначається, що в змовах з названим мотивом спостерігається композиційний принцип ступінчастого звуження.

Змова, замовний мотив, сюжетообразующім функція, міфологічний центр, локус, персонаж, язичництво, християнство.

Да праблемы вызначэння ролі і суадносін матываў у межах сюжэта фальклорнага твора звярталіся даследчыкі, якія ў той ці іншай ступені распрацоўвалі пытанне тэарэтычнага асэнсавання паняцця “матыў”. Так, Б. Пуцілаў у працы “Мотив как сюжетообразующий элемент” [11] адзначыў, што “для большасці фалькларыстаў матыў у фальклорным творы – гэта адносна самастойны, завершаны і адносна элементарны адрэзак сюжэта” [11, с. 143]. Аўтар выказвае справядлівае меркаванне, што “… шлях да разумення сюжэта, твора ў цэлым, ляжыць праз самы дэталёвы разгляд матываў, якія яго складаюць” [11, с. 143]. Традыцыйныя ўяўленні і погляды на матыў як на сюжэтаўтваральную адзінку, што бяруць пачатак ад А. Весялоўскага і пераважаюць у сучаснай навуцы, Б. Пуцілаў лічыць недастатковымі і схематычнымі, асабліва “ў святле сучасных структурна-тыпалагічных даследаванняў фальклору…” [11, с. 143]. Матыў, на думку даследчыка, з’яўляецца элементам “эпічнай сюжэтнай сістэмы. Матыў функцыянуе ў складзе сістэмы, тут ён знаходзіць сваё пэўнае месца, тут цалкам выяўляецца яго канкрэтны змест. Разам з іншымі матывамі (і іншымі тыповымі элементамі) дадзены матыў ставарае сістэму” [11, с. 144]. Такім чынам, сюжэт уяўляе сабой сістэму матываў, і як элементы гэтай сістэмы, “яны самі ўяўляюць

мікрасістэмы, якія маюць сваю структуру, свае асаблівасці і магчымасці” [11, с. 144]. Таму, каб зразумець сюжэт, як слушна зазначае даследчык, неабходна дэталёва разгледзець матывы, якія яго складаюць: “Выдзяленне матываў, падзел сюжэтаў на матывы, якія іх складаюць, вывучэнне матываў з пункту гледжання іх генезісу, бытавога і гістарычнага прымеркавання, развіцця, вар’іравання, а галоўнае – з пункту гледжання іх мастацкіх адносін да цэлага, г.зн. да сюжэта, – усё гэта цяпер уяўляе абавязковую і важнейшую частку гістарычна-фальклорнага аналізу” [11, с. 143]. Таксама даследчык адзначае, што “вывучэнне фальклорнага сюжэта мае на ўвазе аналіз сукупнасці ўсіх элементаў, выяўленне семантычных, структурных сувязей, адносін паміж персанажамі, выяўленне скрытых планаў”, таму, “каб прачытаць сюжэт, неабходна прааналізаваць матывы, якія ўвайшлі ў яго – не толькі ў іх устойлівых значэннях, але і ў новым іх абліччы” [12, с. 188.].

Спецыяльных даследаванняў, якія былі б прысвечаны класіфікацыі і характарыстыцы асобных замоўных матываў, у беларускай фалькларыстыцы не праводзілася. Да разгляду замоўных матываў звярталіся расійскія даследчыкі. Т. Агапкіна, напрыклад, вылучае спецыяльныя, міжфункцыянальныя матывы, што “дазваляе ў дэталях убачыць сюжэтны склад кожнай функцыянальнай групы палескіх замоў” [10, с. 19], прапануе аб’яднаць некалькі матываў (сярод іх “Вытокі і характарыстыкі хваробы”, “Выгнанне хваробы з частак цела”, “Няхай хвароба не шкодзіць чалавеку і яго целу”, “Хваробе не быць ніколі”, “Выгнанне хваробы ў далёкія, пустынныя месцы”, “Выгнанне хваробы туды, дзе нічога не адбываецца”, “На “тым” свеце/там, куды адсылаюць хваробу, яе чакаюць у госці, там пір, адпачынак і весялосць” [10, с. 96-97]), якія “сустракаюцца ў самых розных групах лекавых замоў і нават у замовах сацыяльна-бытавой і гаспадарчай накіраванасці” [10, с. 96], што, на думку даследчыцы, дае магчымасць “вылучыць іх у асобны сюжэтны тып, названы... “універсальны тып замоў”. Універсальнасць абумоўлена... яго прынцыповай поліфункцыянальнасцю, а аб’яднанне ў адзін тып некалькіх матываў тлумачыцца высокім узроўнем іх звязанасці адзін з адным, паколькі ў

большасці выпадкаў пры з’яўленні аднаго з матываў, які ўваходзіць у гэты тып, можна чакаць і іншых” [10, с. 96]. У. Кляус, хоць і не гаворыць аб прынцыповай нязгодзе адносна прадстаўленай Т. Агапкінай умоўнай класіфікацыі замоўных матываў, аднак выказвае сумненне наконт вылучэння сярод матываў “універсальных” і “міжфункцыянальных”, бо і тыя, і другія, на яго погляд, поліфункцыянальныя. “Наўрад ці можна таксама, – працягвае думку даследчык, – цэлы шэраг матываў, аднесеных аўтарамі да “спецыяльных”, вызначыць менавіта такім чынам, бо зварот да больш шырокага ўсходнеславянскага матэрыялу паказвае іх поліфункцыянальнасць” [8, с. 82]. Вопыт класіфікацыі замоўных матываў Т. Агапкінай і вялікі фактычны матэрыял, запісаны ў розных раёнах Гомельшчыны, дазваляе вылучыць наступныя матывы: спецыяльныя (характэрныя для канкрэтнай функцыянальнай групы, напрыклад, матыў “Узнаўленне цэласнасці” ў замовах “Ад звіху”), міжфункцыянальныя (якія сустракаюцца ў некалькіх функцыянальных групах, напрыклад, матыў “Вытокі хваробы” ў замовах “Ад суроку”, “Ад пужання” і інш.) і ўніверсальныя (якія сустракаюцца ў розных тэматычных групах, напрыклад, матыў “Зварот замаўляльніка …” у групе лекавых, гаспадарчых, сямейна-бытавых замоў).

Падчас аналізу замоўных матываў у першую чаргу звяртаецца ўвага на вызначэнне функцыянальнай ролі матыву ў замоўным тэксце. У межах прапанаванага артыкула мы прааналізуем сюжэтаўтваральныя матывы ў беларускіх і ўкраінскіх лекавых замовах.

Да ліку асноўных міжфункцыянальных матываў усходнеславянскіх лекавых замоў, якія выконваюць сюжэтаўтваральную функцыю, адносіцца матыў “Міфалагічны цэнтр, у якім знаходіцца лекар” (далей МЦ). Распаўсюджанасць вышэйназванага матыву тлумачыцца тым, што “пераносам дзеяння ў сакральную прастору… забяспечваецца магчымасць вырашэння крытычнай сітуацыі, якая з’явілася прычынай звароту да замовы” [10, с 157]. Адметнасць гэтага матыву – у разнастайнасці структурных кампанентаў (у першую чаргу суб’ектаў дзеяння і акалічнасцей), на выбар якіх аказаў уплыў міфалагічны светапогляд беларусаў. У якасці суб’ектаў выступаюць

персанажы, якія выконваюць асноўнае дзеянне, а ролю акалічнасці выконваюць локусы, дзе гэтае дзеянне адбываецца. Расійскі даследчык У. Кляус прапануе падзяліць усе локусы на 2 групы – першасныя і другасныя. “У якасці першасных, асноўных локусаў… на якіх знаходзяцца ўсе астатнія…” [7, с. 88], ён вылучыў зямлю, мора, востраў і неба. Неабходна адзначыць, што на кожным з першасных МЦ у большасці выпадкаў прысутнічаюць і “другасныя локусы” (азначэнне У. Кляуса, гл. [7]): дрэвы (дуб, груша, бяроза, дрэва, елка (ель), вярба, яблыня, явар, хвоя, асіна, сасна, іва, каліна, рабіна, вяз), камень, востраў Буян, “цэркаў-сабор”, мора, лукамор’е, “прэстол”, кравать, хатка, калода, бор, каморы, касцёл, крыніцы, ручайкі, гроб, калок, рака, святліца, тын, яйка і інш. У замовах даволі падрабязна прадстаўлены локусныя атрыбутыўныя характарыстыкі, звязаныя з геаграфічнай прасторай і ландшафтнымі рэаліямі.

Звернемся непасрэдна да характарыстыкі асноўных локусаў, на якіх адбываецца дзеянне. Мора – гэта той МЦ, за якім пачынаецца іншасвет, свет мёртвых (локус, які з’яўляецца мяжой паміж светам жывых і светам мёртвых). “У народных павер’ях і фальклорных тэкстах той свет апісваецца як аддаленая прастора, якая знаходзіцца… за марамі…” [3, с. 372]. У Бібліі сказана, што Гасподзь “черту провел над поверхностью воды, до границ света со тьмою” [Книга Иова **26** 10]. Сімволіка мора як мяжы падкрэсліваецца ў замоўных формулах “Ад зубнога болю”, “Лячыць зубы”: маладзік “*у моры купаўся і нам паказаўся*” (в. Града Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, запісана ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.); “*на морэ-кияне, на морэ-буяне маладзик малады купаўся*” [10, с. 278, № 500] (в. Залатуха Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці). Як вядома, вобраз маладзіка вызначаецца ярка выражанай амбівалентнасцю, якая праяўляецца ў тым, што “месяц адначасова прадстае звязаным з жыццём і смерцю” [13, с. 223]: “*Добрый вэчыр, мисяцю-королэвычу! Добрый вэчыр. – Дэ ты був? – Я був на Усиняньских горах. – А шо ты там бачыв? – Мэртвы в зэмли, рыба в води. Их ничого нэ болыть, нэ ломыть. Шоб в раба Божого такого-то нэ болилы зубы*” [10, с. 275, № 491] (в. Грабава Любомльскага раёна Валынскай вобласці). Аб сувязі месяца з

прыроднымі і жыццёвымі цыкламі нагадвае І. Казакова, адзначаючы, што “сярод розных народаў свету былі распаўсюджаны вераванні, што цыкл жыцця і смерці на зямлі – нараджэнне і ўвяданне раслін, жывёл і людзей – звязаны з ростам і ўбываннем Поўні, з яе бясконцым цыклам нараджэння і смерці на небе” [6, с. 94]. Падобныя вераванні выкарыстоўваліся і ў магічных практыках. Так, у в. Выступовічы Оўручскага раёна Жытомірскай вобласці пры лячэнні дзіцячых сухотаў “*трэба его до месяца нести на росходни дороги, где росходятца дороги. И так его ў двенадцать часов ночы понеси и подними его выше головы и кажы: “Месяц высокосный, дай тела на кости” (там называешь, кому трэба)*” [10, с. 80, № 106].

У некаторых замовах, у якіх МЦ з’яўляецца мора, сустракаюцца біблейскія алюзіі. Так, у замове ад крывацёку, запісанай у в. Ухавецк Ковельскага раёна Валынскай вобласці ўзгадваюцца святыя Петр і Павел, якія павінны дапамагчы хвораму: *“... И ты, Пэтро, и ты, Паўло, ходы по моры гораты, (Имярек) христиански крови замовляты*” [10, с. 183, № 300]. У в. Шарсцін Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці запісаны тэкст, фрагмент якога пераклікаецца з біблейскім сюжэтам: “*Із сіняга мора едзе Ісус Хрыстос…*” [2, с. 25] (параўн.: “В четвертую же стражу ночи пошел к ним Иисус, идя по морю…” [Евангелие от Матфея **14** 25-26]). Праз “сіня мора” едзе “*з трыма мячамі, з таўтом (?), з залатым крастом*” Божая Маці [4, с. 304, № 1025] (в. Асарэвічы Брагінскага раёна, в. Карпаўка Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці), па “*морэ ходыла, чорну рожу сияла*” Божая маці ў замове, запісанай у в. Ухавецк Ковельскага раёна Валынскай вобласці [10, с. 183, № 300]. Яна таксама нясе тры рожы: “*одну – водзяную, вторую – огняну, трецью – крываву*”, якія знікаюць: “*водзяна – разлівалася, крывава – разышлася, агнена – огнём зышла*” (в. Пухавічы Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, запісана ад Купрацэвіч Вольгі Прохараўны, 1943 г.н.). Часта ў замовах ад крывацёку прысутнічае матыў “Тры ракі…”. Адметнымі падаюцца ўкраінскія замовы, дзе гэты матыў, як адзначае Т. Агапкіна “апеліруе да тэмы распяцця Хрыста” [10, с. 175, № 281]: “*С Исуса Христа тры рэки тэкло: водяныи, камэныи, крывляныи, водяны побиглы,*

*камяны покатылысь, у раба Божого кривляны зустанавылысь*” [10, с. 175, № 281] (в. Любязь Любяшоўскага раёна Валынскай вобласці). Ва ўкраінскіх замовах сустрэўся матыў “Тры ракі…” ў субматыве: “Тры посуды…” (“*Ишла пани, несла три штакани, в одном штакани – горилка, в другому – кроў, в третем – вода. Горилку я вйпью, воду я вйлью, а кроў зопеню*” [10, с. 176, № 284] (в. Вознічы Оўручскага раёна Жытомірскай вобласці)).

Сярод персанажаў, якія дзейнічаюць на МЦ, сустракаюцца як хрысціянскія, так і язычніцкія персанажы, і птушкі, і замаўляльнік. Як адзначае В. Ільінская, “несумненную цікавасць уяўляе … вылучэнне ў тэкстах замоў двух пластоў – язычніцкага і хрысціянскага, а гэта можна зрабіць, аналізуючы змену персанажаў на тым самым Латыры-камні ад краснай дзевіцы да Багародзіцы, ад жалезнага мужа да Хрыста…” [5, с. 38]. Язычніцкія персанажы (Баба Яга, бабка, тры бабушкі, тры дзявіцы і інш.) мы сустракаем як у беларускіх, так і ва ўкраінскіх замовах: “*На ціхом море, на акіяне, на востраве Буяне стаіт вяз, пад тым вязам ляжыць белы камень, на том камне сідзіт баба Яга. Она не ўмеет ні піць, ні есць, ні ткаць, ні прасць, ні вышываць, толькі ў рабы божэй (імя) паддзелку выгаварываць…*” (в. Клімаўка Гомельскага раёна, запісана ад Мятліцкай Васілісы Васільеўны, 1939 г.н. (раней пражывала ў г. Хойнікі)); “*На синем море камень, на камене стаиць крэст, ля крэста стаяла хатка, а ў той хатце сидзела бабка, и яна не умела ни прасци, ни ткаць, тоўка умела на шляху стаяць и пристреку гаваряць…*” [10, с. 153, № 239] (магчыма, калі б гэты тэкст з’явіўся ў час хрысціянства, хатка ля крыжа была б заменена царквой, а бабка – Багародзіцай). “*На сінім морушке, на белом камушке сядзелі тры бабушкі… Шылі, вышывалі, нам ад зглаза помашч давалі*” (в. Тварычаўка Мазырскага раёна Гомельскай вобласці, запісана ад Еўдакавец Вольгі Іванаўны, 1938 г.н.) (вар. [14, с. 172, № 457] г. Добруш Гомельскай вобласці); “*На моры ляжаў камень, на тым камені сядзелі тры дзявіцы, тры сястрыцы. Яны адна з адной змагаюцца. Адна кажа: “Я шоўкам вышываю”. Другая: “Узоры накладаю”, а трэцяя: “Нарадку выганяю…*” [14, с. 188, № 499] (в. Чкалава Гомельскага раёна). Тры дзявіцы, тры родныя сястрыцы, адна з якіх “*урокі ўгаварывае, другая*

*хусты вымывае, а трэцяя прыгаворы ізымае*” [14, с. 172, № 459] (в. Залаўе Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці), сядзяць на сінім камені за новымі варотамі. Магчыма, падобныя тэксты з’яўляюцца найбольш раннімі па часе ўзнікнення, калі хрысціянства ці яшчэ не аказвала, ці толькі пачало аказваць уплыў на свядомасць людзей. “Суадносімыя па колькасці ўпамінанняў у групе хрысціянскіх персанажаў вобраз Багародзіцы і жаночыя вобразы ў групе язычніцкіх персанажаў могуць быць паказальнікам калі не працэсу стадыяльнай змены дзявіц і іншых (жаночых вобразаў – **С.В.**) Багародзіцай, то дадатковым указаннем на вялікую папулярнасць у славянскіх замоўна-заклінальных тэкстах жаночых вобразаў, што можа быць звязана са старажытнейшымі культамі жаночых багінь (бостваў)” [7, с. 82]. Такім чынам, МЦ, створаны ў замовах, прынцыпова амаль нічым не адрозніваецца ад уяўленняў пра “гэты свет” і можа ўсведамляцца як цэнтр менавіта “гэтага свету”. “Ва ўсялякім выпадку, ніякіх прыкмет перыферыйнасці ці маргінальнасці “міфалагічнага цэнтра” ў беларускіх лекавых замовах мы не назіраем” [1, с. 306].

Сярод язычніцкіх персанажаў, якія не асацыіруюцца з хрысціянствам і ў беларускіх, і ва ўкраінскіх лекавых замовах дзейнічаюць на сінім (Сіянскім) моры “бабка”, якая “*наўгадуе падомкі, падзеўкі, падсмехі*” (в. Кротаў Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці, запісана ад Пазняк Марыі Данілаўны, 1936 г.н.); тры бабкі “*сядзяць, залатнічка дзержаць да й вымаўляюць, на сваё места настаўляюць*” [4, с. 232, № 784] (в. Ручаёўка Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці); “дзеўка”, якая “*нэ умела ны пысать, ны чытать, бэду одмовлять*” [10, с. 258, № 440] (в. Чудзель Сарненскага раёна Ровенскай вобласці); “*паны ў карты гуляюць, сталы засцілаюць, кубкі віна наліваюць, п’юць, гуляюць, пярэпалаха ў госці зазываюць*” (в. Сінск Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці, запісана ад Прышчэп Марыі Ульянаўны, 1927 г.н.); пані, якая “*ни магла ни писаць, ни читаць, тульки белый кужэль чесаць*” [10, с. 357, № 658] (в. Жахавічы Мазырскага раёна Гомельскай вобласці), “*на морэ хрэст, на хрэсту панна. Вона нэ умие нэ шыты, нэ вышываты. Она умие урокы одмоўляты*” [10, с. 139, № 207] (в. Чудзель Сарненскага раёна Ровенскай

вобласці), “*на моры хрэст, на хрэсту панночка, та панночка нэ умила ни шиты, ни прасты, а уроки ўмоўляты*” [10, с. 140, № 208]; замаўляльнік на сінім моры “*кажухі знімае, злога духа пабівае і выганяе*” з розных частак цела [4, с. 264, № 887]. У замове “Ад грыжы”, запісанай у в. Печышчы Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці, па мору плыве “гогаль” (птушка сямейства качыных), паўзе рак, ляжыць мярцвец, сядзіць певень. Усе яны не маюць “*ні сіняй, ні краснай опухалі, ні хамута (грудная хвароба, адышка)*” (запісана ад Кемень Надзеі Платонаўні, 1925 г.н.). У замове “Урокі шэптаць”, запісанай у в. Чудзель Сарненскага раёна Ровенскай вобласці “*На море чоўнышче, там чорный жыдышче, Оно нэ умило нэ читать, не пысать, А уроки шептать*” [10, с. 140, № 209]. За сінім морам “тры паненкі” “*сіні камень рубалі, костачкі збіралі*” [4, с. 164, № 521] (в. Гарохавішчы Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці).

У пераважнай большасці тэкстаў мора звязана і з другаснымі локусамі (камень, востраў Буян і інш.), дзе і адбываецца асноўнае дзеянне: “*На моры, на акіяне, на вострaві Буяні, там ліжав булат-камень, на том камні стаіць яблыня, на той яблыні вісіць яблычка, нічым вражоная…*” [14, с. 185, № 496] (в. Юркавічы Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці); “*На сынёму мори стоить дуб зэлэны, под тим дубом стоить столык засланы, около того столыка сыдыть баба Шаровоня*” [10, с. 140, № 209] (в. Вышевічы Радомышльскага раёна Жытомірскай вобласці); “*на морйе, на лукаморйе стаит дуб, на том дубу залатая кара. Пад тым дубам лежать тры хорты*” [10, с. 243, № 410] (в. Харобічы Гараднянскага раёна Чарнігаўскай вобласці); “*На сінім моры стаіць дуб зялёны, на тым дубу 12 какатоў. На тых какатах стаяць 12 касцёлаў, у тых касцёлах 12 прыстолаў…*” [14, с. 183, № 492] (в. Княжынка Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці); “*На сіням моры, на востраве стаяла цэрква з саборам. Жалезным тынам агароджана, залатымі ключамі замкнута…*” [14, с. 175, № 465] (в. Пакалюбічы Гомельскага раёна); “*на сыньому мори цэрковка стойить, пэрэд цэрковкою прэстол…*” [10, с. 103, № 144] (в. Чырвоная Валока Луганскага раёна Жытомірскай вобласці); “*я йду*

*за сыне морэ, там цэрква стоить, прэстол стоить…*" [10, с. 259, № 441] (в. Грабава Любомльскага раёна Валынскай вобласці).

Не менш папулярным другасным локусам ў лекавых замовах з'яўляецца Алатыр-камень. Лічыцца, што ён суадносіцца са святымі, а персанажы і культавыя збудаванні, якія знаходзяцца на гэтым камені, падкрэсліваюць яго святасць і набываюць дадатковыя локусныя і атрыбутыўныя характарыстыкі: "*На сінім моры, на белым камне сідзіць там Гасподзь Бог з Ісусам Хрыстом, з янгаламі…*" [14, с. 160, № 420] (в. Пракопаўка Гомельскага раёна); "*На сінім моры, велікаморы ляжыць белы камень, белы камень Лагір. На тым камні сядзіць маць Прачыстая, дзяржыць Ісуса Хрыста ў паркалі, вымывае халоднай вадой…*" [4, с. 269, № 905] (в. Мілашавічы Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці); "*стояв на моры камэнь. На том камэни Божа маты. Дэржала золотые ключы на правому плэчы*" [10, с. 29, № 8] (в. Чудзель Сарненскага раёна Ровенскай вобласці); "*на сінем моры ляжыць камень – адзін метр шырыня, сорак сажняў глыбіня, на ім стаяў сам Гасподзь Бог, залатым кіем апершы…*" (сажэнь = 2,1336 м, 40 сажняў = 85,344 м. Гэты камень больш падобны на скалу, а "*пад тым камнем ляжыць дзевяць камней*" [4, с. 301, № 1015] (в. Прыбудак Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці)); "*на сінім моры камень плыве, на тым камені залата цэрква стаіць, а ў той цэркві залаты прыстол. На тым прыстолі… Ісус Хрыстос сідзіць…*" [4, с. 299, № 1011] (в. Клінок Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці); "*на сінем море стоить камень, на камене монастырь, в монастыре пристол, на пристоле Исус Христос сидеў и книжку чытаў, уроки выгавораў…*" [10, с. 156, № 244] (в. Верхнія Жары Брагінскага раёна Гомельскай вобласці); "*на моры ляжыць камень, на том лажары стаіць цэрква-сабор. На том саборы стаіць Апостал і прастол*" (в. Сычаўка Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці, запісана ад Івашковай Вольгі Лявонцьеўны); "*на Чорному мору камэнь лэжыть, на камэни прыстыл стоить, на прэстолэ книжка лэжать, святэ вси приходыть читать…*" [10, с. 66, № 76] (в. Паворск Ковельскага раёна Валынскай вобласці); "*… на сінім моры стаіць дуб, пад дубам ляжыць камень, на тым камені*

*ляжыць прыстол… Над тым прыстолам стаіць поп і з жыватварашчым і з вялікім крастом…*” [9, с. 45] (Кармянскі раён Гомельскай вобласці).

Такое размяшчэнне другасных локусаў (у розных варыянтах) даволі распаўсюджана, што звязана з псіхалогіяй чалавека, які хацеў усюды бачыць парадак: гармонію ў прыродзе, у самім чалавеку (здароўе, а не хвароба – сапраўдны парадак), парадак у прасторы і часе. У дадзеных прыкладах гэты матыў і з’яўляецца вынікам структуравання прасторы па прынцыпу яе ступянёвага звужэння. Найбольш аб’ёмная прастора (мора-акіян) паслядоўна ўключае ў сябе прасторы меншага памеру (востраў, камень і г.д.), у выніку чаго атрымліваецца кампактная, упарадкаваная карціна.

Такім чынам, вызначальным кампанентам сюжэтаўтваральнага матыву “Міфалагічны цэнтр, у якім знаходзіцца лекар…” выступае локус, на якім адбываецца асноўнае дзеянне. У замоўным кантынууме вылучаюцца дзве групы локусаў: першасныя (мора, поле, горы і інш.) і другасныя (дрэва, камень, востраў і інш.). Вылучанасць локусаў (першасныя і другасныя), на якіх адбываецца дзеянне суб’екта, абумоўлена асаблівасцямі міфалагічнага светапогляду нашых продкаў: “Свае веды пра свет чалавек эпохі архаікі абагульняў у выглядзе нейкага канкрэтнага вобраза, мадэлі” [15, с. 38]. У якасці такіх мадэляў, што ўвасабляюць свет (у нашым артыкуле – гарызантальных) выступае мора, на якім прысутнічаюць другасныя локусы – камяні, востраў Буян, дрэвы і інш. Вобраз Сусветнага Дрэва адлюстраваўся ў найбольшай ступені ў замовах, якія “грунтаваліся і на рэальным вопыце чалавека – яны вельмі канкрэтныя. Так, часцей за ўсё, Сусветнае Дрэва ў іх дуб” [15, с. 42]. У замовах з названым матывам назіраецца кампазіцыйны прынцып прыступчатага (ступянёвага) звужэння (мора-акіян, востраў Буян, камень, дуб і г.д.). Яскрава мадэліруюцца ўяўленні старажытнага чалавека аб сусвеце: цэнтр, перыферыя, мяжа.

Светлана Вергеенко

Сюжетообразующие мотивы в белорусских и украинских заговорах

В статье рассматриваются вопросы, касающиеся функциональной роли одного из основных межфункциональных мотив “Мифологический центр, в котором

находится лекарь…” в белорусских и украинских заговорах. Анализируются локусы и персонажи, которые являются основными структурными компонентами названного мотива. Отмечается, что в заговорах с названным мотивом наблюдается композиционный принцип ступенчатого сужения.

Заговор, заговорный мотив, сюжетообразующая функция, мифологический центр, локус, персонаж, язычество, христианство.

Svetlana Vergeenko

Plot-motifs in the Belarusian and Ukrainian plots

The paper discusses the functional role of one of the major cross-functional motif of "mythological center, which is a healer ..." in Belarusian and Ukrainian conspiracies. Loci analyzed and the characters, which are major structural components called motive. It is noted that in a plot called the motif observed compositional principle of stepwise narrowing.

Conspiracy zagovorny motive, plot-function, the mythological center, locus, character, Paganism, Christianity.

## Крыніцы і літаратура

1. Агапкина, Т.А. Эпитет в белорусских лечебных заговорах: функции и семантика / Т.А. Агапкина // Признаковое пространство культуры / Отв. ред. С.М. Толстая. – М. : «Индрик», 2002. – С. 301-337.

2. Вечнае: Фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна / аўт.-уклад.: І.Ф. Штэйнер, В.С. Новак. – Гомель : УА “ГДУ імя Ф.Скарыны”, 2003. – 362 с.

3. Виноградова, Л.Н. Тот свет / Л.Н. Виноградова / Славянская мифология. Энциклопедический словарь. – М. : Издательство: Эллис Лак, 1995 г. – С. 372-374.

4. Замовы / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г.А. Барташэвіч; рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 597 с.

5. Ильинская, В.Н. Камень Латырь и его роль в русских заговорах / В.Н. Ильинская // Этнолингвистика текста. Семиотика малых форм фольклора: тезисы и предварительные материалы к симпозиуму. – М., 1988. – С. 37-38.

6. Казакова, І.В. Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем (на матэрыялах беларускага фальклору) / І.В. Казакова // навук.рэд. А. С. Фядосік. – Мн. : “БОФФ”, 1999. – 221 с.

7. Кляус, В.Л. Сюжетика заговорных текстов славян в сравнительном изучении. К постановке проблемы / В.Л. Кляус. – М. : ИМЛИ РАН, “Наследие”, 2000. – 192 с.

8. Кляус, В. Теоретические проблемы систематизации заговорно-заклинательного фольклора / В. Кляус // Фольклористика в контексте наук о традиционной духовной культуре. Вопросы теории и методологии. Сборник материалов тематического блока XIV Международного съезда славистов (Македония, Охрид, 2008 г.). – М. : Государственный республиканский центр русского фольклора, 2008. – С. 76-86.

9. Крыніц кармянскіх перазвоны (абрады і песні ў сучасных запісах) / укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца, уступны артыкул В.С. Новак; пад рэд. І.Ф. Штэйнера. – Гомель : Гомельскі цэнтр навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 2000. – 210 с.

10. Полесские заговоры (в записях 1970-1990 гг.) / сост., подготовка текстов и коммент. Т.А. Агапкиной [и др.]. – М. : Издательство “Индрик”, 2003. – 752 с.

11. Путилов, Б.Н. Мотив как сюжетообразующий элемент / Б.Н. Путилов // Типологические исследования по фольклору. Сборник статей памяти В.Я. Проппа (1895-1970). – М., 1975. – С. 141-155.

12. Путилов, Б.Н. Фольклор и народная культура / Б.Н. Путилов. – СПб. : Наука, 1994. – 239 с.

13. Словарь символов и знаков / авт.-сост. Н.Н. Рогалевич. – Мн. : Харвест, 2004. – 512 с.

14. Таямніцы замоўнага слова / уклад., сістэм. тэкстаў, уступны арт., каментарыі і рэдаг. І.Ф. Штэйнера, В.С. Новак. – Гомель : Беларускае Агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1997. – 320 с.

15. Шамякіна, Т.І. Славянская міфалогія / Т.І. Шамякіна. – Мінск : «Рівш», 2005. – 155 с.